Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»
Исторический факультет

# БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННОСТЬ: ИСТОКИ, СТАНОВЛЕНИЕ, РАЗВИТИЕ (IX–XXI вв.)

Материалы
Республиканской научно-теоретической конференции

Минск, 29 июня 2017 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск
РИВШ
2017

УДК 323(476)(091)(082)
ББК 66.3(4Беи)я43
Б43

Рекомендовано

советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 10 от 24 мая 2017 г.)

Редакционная коллегия:
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Рецензенты:
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

Б43 **Белорусская** государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.) : материалы Респ. науч.-теорет. конф., Минск, 29 июня 2017 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2017. – 232 с.
ISBN 978-985-586-041-0.

В сборнике представлены актуальные материалы исследований, посвященные проблемам белорусской государственности в историческом, социально-культурном и геополитическом аспектах.

Адресуется преподавателям, аспирантам и студентам вузов.

**УДК 323(476)(091)(082)**
**ББК 66.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-586-041-0**

© Оформление. ГУО «Республиканский
институт высшей школы», 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сделать наш город более комфортным для жителей и гостей столицы. Каждый житель должен ощущать, что Минск – это его родной город. Много сделано, много делается, но многое еще предстоит сделать в части совершенствования системы уборки и утилизации, организации движения транспорта, содержания жилого фонда и проезжей части улиц, парковки личного транспорта, восстановления исторически ценных мест и сооружений.Потенциал для решения этих вопросов у нас есть, а значит, наша столица займёт достойное место в ряду лучших городов Европы.

Наша школа гордится сотрудничеством с филиалом «Автобусный парк №5» ГП «Минсктранс».

## ВУЛІЦА ІМЯ ЯНА ЧАЧОТА МАСКОЎСКАГА РАЁНА Г. МІНСКА

***Плесканёва А.С., 1 курс, філалагічны факультэт, БДПУ, Мінск***
***навук. кір. – Рацько А.Ф., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДПУ***

«Любой город, как живой организм, обладает венами и артериями. Это улицы. А наполнение их – кровь города, его обитатели. Направление потоков всегда определенно и полезно. Утром люди несутся на работу, заполняя артерии и средства транспорта, днем неработающие и работающие ходят по магазинам, вечером по венам стекаются к своим жилищам, а потом порой покидают их снова, совершая вылазки в кино или на дискотеку» [1].

Гэтая цытата як ніякая іншая адлюстроўвае ўсю сутнасць вуліц. Яны сустракаюць нас, калі мы прыяжджаем у горад, праводзяць, калі пакідаем яго. У нашым жыцці іх сотні, тысячы, і кожная з іх асаблівая. На адных нам хочацца затрымацца, іншыя – зусім не ўзгадваць. На трэціх жывуць нашы любімыя людзі, на чацвёртых – нашы ворагі. Ёсць вуліцы ўрачыстыя, якія паказваюць сабой усю сутнасць горада, а ёсць зусім непрыкметныя і таямнічыя, на якіх нам пашанцавала згубіцца. Любая вуліца – вынік жыццядзейнасці людзей, якія жывуць на ёй.

Сёлета сваё саракагоддзе святкуе наш Маскоўскі раён сталіцы. Её з’яўляецца самым маладым ў Мінску. Утвораны яшчэ ў 1977 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за кошт разузбуйнення Кастрычніцкага і Фрунзенскага раёнаў. Тэрыторыю раёна можна ўмоўна падзяліць на дзве часткі. 1-я – размешчана ў цэнтральнай частцы горада і складаецца з аб'ектаў культуры, адукацыі, гандлёвых. 2-я частка – гэта спальныя раёны [2]. Большасць з вуліц носіць імёны славутых дзеячаў беларускай зямлі. Гэта такія вуліцы, як Янкі Брыля, Канстанцыі Буйло, Тышкевічаў, Кандрата Крапівы, таксама плошча Францішка Багушэвіча і шмат іншых.

Каб бліжэй пазнаёміцца з гэтым раёнам, зразумець, якія людзі тут жывуць і чым яны займаюцца, я зрабіла невялікае падарожжа на суседнюю са мной вуліцу ў вельмі прыемнай мне кампаніі. Таму для мяне гэтае месца ўжо зусім не «адно з», не проста частка вялікага горада, а нешта, што аддаецца цяплом ўнутры, калі ўзгадваеш аб ім. Вуліца гэта носіць імя Яна Чачота.

Нарадзіўся Ян Чачот у Навагрconsidered Навагрудскім павеце Меншчыны. Разам са сваім славутым земляком Адамам Міцвевічам вучыўся Ян ў дамініканскай павятовай школе Навагрудка. Там, набыўшы сярэднюю адукацыю, Чачот паступіў у Віленскі ўніверсітэт на аддзел маральных і палітычных навук. І тут ён пасябраваў з Адамам Міцкевічам і разам з будучым класікам польскай літаратуры захапіўся тагачаснымі ідэямі і рамантычным настроем.

За прыналежнасць да нелегальнага студэнцкага гуртка Ян Чачот быў высланы расійскім урадам на Урал. У выгнанні, у розных гарадах Расіі, прабыў каля 20-ці гадоў. Толькі ў саракавых гадах XIX ст. вярнуўся у родны край і жыў спачатку ў Леплі, Віцебскай губерніі, а потым пры двары пана Храптовіча ў Шчорсах на Навагрудчыне, дзе быў бібліятэкарам багацейшай, ведамай на ўсю Беларусь, бібліятэкі. Пад канец жыцця жыў Ян Чачот у сваіх школьных таварышаў. Памёр 23 жніўня 1847 г. у Друзгеніках.

Ян Чачот жыў і працаваў у часы рамантызму. Развіццю ў ім рамантычнасці спрыяла яго жыццё, і па натуры, як пісалі яго біёграфы, гэта быў чалавек мяккага пачуцця, успрымлівы і ўражлівы, могучы лёгка знервавацца і засумаваць. Рамантызм даў Яну Чачоту



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

любоў да народнай паэзіі і подзвіг яго на шлях складання беларускіх вершаў, падобных да народных песень. Пісаў ён па-польску і па-беларуску. Друкаваныя зборнікі Яна Чачота, усяго 6 кніжак, выйшлі ў 1837-1846 гг. у Вільні, пад назвай "Сялянскія псені" [3, с. 184-189], куды ўвайшлі 1000 песень у перакладзе на польскую мову і ў арыгінале, прыказкі і прымаўкі, слоўнік беларускай мовы (200 слоў) і ўласныя вершы. Ян Чачот таксама з'яўляецца аўтарам кніг «Аповесці для маладых дзяўчат» (1845), «Некаторыя заўвагі, якія асабліва датычацца стылю трэцяй песні «Анафеляс» з «Вітаўтавых баёў» П. Крашэўскага» (1846), лібрэта аперэты «Малгажата з Зембаціна». Выяўлены вялікі цыкл яго песень-балад на польскай мове «Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 г.» (1842-1844 гг.). Многія яго вершы пакладзены на музыку Томашам Занам. На беларускую мову творы Яна Чачота пераклаў К. Цвірка [4, с. 264-265].

Значэнне Чачота ў гісторыі нашай літаратуры, галоўным чынам, такое, што ён пабуджаў беларускасць і натуральным спосабам вывеў кніжную творчасць з творчасці народнай, а зрабіў гэта ў беларускай мове, значыцца, даў ён нацыянальны грунт для дальнейшага развіцця [4]. Ніжэй прывезены адзін з вершаў пісьменніка:

Голуб
Я паслаў бы, голуб,
Цябе ў любы край,
Дзе маё каханне,
Дзе мой светлы май.
Мо б занёс праз далеч
Мілай колькі слоў:
Лейлі, ты мне люба,
Жыў я і здароў.
Я сказаў бы, голуб:
Мчыся ў добры час,
Між дзяўчат пазнаеш
Мілую ты ўраз.
Твар яе журлівы,
Хоць на вуснах - смех.
І сядзіць самотна
Між людскіх уцех.
Ты яе пазнаеш,
Бо яна - адна,
Самая з наймілых
Мілая яна.
Што яна - красуня,
Слова нават дам.
Ну, а ці сумуе...
Ты ўбачыш сам.

Вуліца Яна Чачота з'яўляецца часткай мікрараёна Брылевічы Маскоўскага раёна горада. Афіцыйнае адкрыццё вуліцы адбылося ў 2007 г. Дабрацца да гэтага месца можа лёгка нават чалавек накшталт мяне, які ўсё яшчэ вельмі дрэнна ведае гэты горад. Дастаткова толькі спусціцца ў метро і выйсці на станцыі «Малінаўка», дзе ў далейшым вас сустрэнуць паказальнікі і накіруюць патрэбным вам шляхам.

Так як вуліца даволі маладая, то на ёй шмат новых яркіх шматпавярховак, з добра абсталяванымі дзіцячымі пляцоўкамі. Праходзячы міма некаторых з іх, так і хацелася затрымацца і, успомніўшы дзяцінства, пачаць лазіць па горках, турніках, гойдацца на арэлях.

На вуліцы Яна Чачота ёсць ўсё, што трэба чалавеку, каб жыццё на ёй было зручнае. Для тых, хто любіць праводзіць спакойныя вечары ў кампаніі добрай кнігі – невялікая бібліятэка, якая размяшчаецца ў адным з дамоў. Прадстаўніцам прыгожага полу не трэба адыходзіць далёка ад дома, каб скарыстацца паслугамі цырульніка, зрабіць манікюр, педыкюр і іншыя жаночыя штучкі па догляду за сабой. Таксама вуліца ўключае ў сябе такія



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

важныя ўстановы, як стаматалагічны цэнтр і дзіцячая паліклініка. Акрамя таго, тут знойдзецца месца і для братоў нашых меншых: на вуліцы знаходзіцца невялікі па памеры, але з вялікім асартыментам тавараў для нашых хатніх улюбёнцаў, зоомагазін.

Асабліва прыгожая вуліца Яна Чачота ў начны час. Быццам тысячы агеньчыкаў асвятляюць яе з усіх бакоў. У вокнах шматпавярховак гарыць святло, а кожнае акно – чыё-небудзь жыццё, і ты ідзеш і міжволі задумваешся, што робіць у гэты момант той ці іншы чалавек, чый сілуэт бачны ў акне. Здавалася б, што з надыходам цемры, людзей павінна станавіцца на вуліцы менш. Але тут усё наадварот. Гуляючы па ёй у такі час, ты сустракаеш такіх жа бесклапотных маладых людзей, якія атрымліваюць асалоду ад вечара і адзін ад аднаго, людзей, якія спяшаюцца дадому пасля цяжкіх працоўных будняў, людзей з іх маленькімі чатырохногімі сябрамі.

Магчыма, маё апісанне вуліцы Яна Чачота нагадала вам не адну вуліцу ў гэтым горадзе. Ды, мабыць, многія з іх падобны адна на адну. Але, на мой погляд, кожная з іх – асаблівая, і асаблівай яе робім мы самі. Я спадзяюся, што наш Маскоўскі раён з часам будзе толькі квітнець, а на старонках часопісаў будуць з'яўляцца толькі добрыя навіны аб ім самім, яго вуліцах і аб іх жыхарах.

**Літаратура**

1. Русская фантастика / Книжная полка [Электронны рэсурс] // Кир Булычев. Опозоренные города – Рэжым доступу: http://books.rusf.ru/unzip/add-on/xussr_av/bulyc322.htm?2/4 – Дата доступу: 25. 03. 2017.

2. Администрация Московского района г. Минска [Электронны рэсурс] // Социально-экономический паспорт района – Рэжым доступу: http://mosk.minsk.gov.by/svedeniya-o-rajone-new/sotsialno-ekonomicheskij-pasport-rajona – Дата доступу: 25. 03. 2017.

3. Максім Гарэцкі : Гісторыя беларускае літаратуры / Уклад. і падрыхт. Тэксту Т. С. Голуб. – Мінск : Маст. літ., 1992. – С. 184 – 189.

4. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. Рэд.) [і інш.]. – Мінск : "Беларуская энцыклапедыя", 2003. – 17 т. – С. 108 – 112.

## МИНСКИЙ МЕТОРОПОЛИТЕН – ВАЖНЕЙШАЯ ТРАНСПОРТНАЯ АРТЕРИЯ МОСКОВСКОГО РАЙОНА МИНСКА

***Рыбак Л.А., 1 курс, физико-математический факультет, БГПУ, Минск***
***науч. рук. – Ратько А.Ф., кандидат исторических наук, доцент, БГПУ***

Московский район – один из самых красивых районов города Минска. Он находится в юго-западной части города, образован в 1977 г. За последнее десятилетие эта часть города Минска потерпела ряд изменений и новообразований. Район славится своими современными архитектурными сооружениями и историческими достопримечательностями. В районе большой популярностью пользуется метро. Через Московский район проходит линия Минского метрополитена, так называемая «синяя ветка». Три станции: «Михалово», «Петровщина», «Малиновка» – являются одними из самых посещаемых минчанами. Минский метрополитен – достопримечательность не только Московского района, но и Республики Беларусь в целом.

3 мая 1977 года было начато строительство Минского метрополитена.

Возведение первой линии метрополитена от станции «Институт культуры» до станции «Московская» было закончено уже в 30 июня 1984 г. Протяженность линии метро составила 7,84 км с восьмью станциями и электродепо «Московское». В период пускового участка главная транспортная артерия города – Ленинский проспект – в течение трех лет была полностью закрыта для движения всех видов транспорта, и не будь серьезной подготовки, город бы столкнулся с непреодолимыми транспортными трудностями. Также было продумано решение проблем с сетью водостоков, теплофикацией, электроснабжением и связью. Следует отметить, что участок первой линии метрополитена был введен в эксплуатацию 29 июня 1984 г., что на 6 месяцев раньше установленного срока. 40-летие



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ